# Першая газета на роднай мове




*Раздзел выстаўкі "Перыядычны друк Гродзеншчыны".*

**Любоў ТУРМАСАВА**

Сёмы год Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я. Ф. Карскага збірае навукоўцаў, краязнаўцаў, супрацоўнікаў музеяў, бібліятэк ды студэнцкую моладзь на Гарадзенскія чытанні. Сёлета яны былі прымеркаваны да 150-годдзя з пачатку выдання "Мужыцкай праўды", першай газеты на беларускай мове, амаль усе нумары якой выйшлі на тэрыторыі Гродзеншчыны напярэдадні і падчас паўстання 1863 года.

Адкрыў чытанні начальнік упраўлення культуры аблвыканкама Аляксандр Вярсоцкі. Ён адзначыў, што газета "Мужыцкая праўда" з'яўлялася рэвалюцыйнай — даследчыкі называлі яе "набатам паўстання 1863 — 1864 гг."

У дакладах аналізавалася роля "Мужыцкай праўды" ў развіцці беларускай культуры, газета як узор мастацкай публіцыстыкі. Прафесар кафедры беларускай культуры і рэгіянальнага турызму Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Аляксей Пяткевіч падкрэсліў значнасць газеты, "якая загаварыла мовай свайго народа". Шэраг дакладаў раскрывалі змест "Мужыцкай праўды": эканамічныя, грамадска-палітычныя, рэлігійныя праблемы; знаёмілі з яе распаўсюджвальнікамі; прадстаўлялі беларускамоўныя выданні 1860-х гг. Дацэнт кафедры гісторыі Беларусі БДУ Віктар Беларовіч зрабіў бліскучы агляд гістарычных крыніц па вывучэнні "Мужыцкай праўды". Уплыў паўстання 1863 — 1864 гг. на культурнае жыццё Гродзеншчыны быў раскрыты ў дакладах прафесара Святланы Куль-Сяльверставай і дацэнта Віталя Карнелюка. Асноўныя тэндэнцыі развіцця і тэматыку перыядычнага друку на гарадзенскіх землях акрэслілі кандыдаты гістарычных навук Святлана Сілава, Аляксандр Богуш, Сяргей Амелька. Палемічнай і вострай была дыскусія падчас падвядзення вынікаў чытання.

Цікавасць выклікаў адкрыты прагляд "«Мужыцкая праўда» — першая дэмакратычная газета на роднай мове", падрыхтаваны аддзелам краязнаўства сумесна з аддзелам рэдкіх кніг і старадрукаў Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея. У першым раздзеле "«Мужыцкая праўда» ў кантэксце беларускай культуры" змешчаны тэксты з газеты і вынікі даследаванняў навукоўцаў, якія прадстаўлены ў энцыклапедычных выданнях, манаграфіях, зборніках навуковых прац, падручніках і вучэбных дапаможніках. Другі раздзел — "Перыядычны друк Гродзеншчыны" — адлюстроўваў газеты рэгіёна, пачынаючы ад "Газеты Гродзеньскай" і заканчваючы сучаснымі. Шырока паказана перыёдыка міжваеннага часу на беларускай, польскай, рускай мовах і нават іўрыце. Тут прадстаўлены і даследаванні навукоўцаў і журналістаў па развіцці перыядычнага друку на гарадзенскіх землях.